


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2009 ГОД

Падпіска на інфармацыйныя выданні НББ у 2009 г. будзе ажыццяўляцца на дагаворнай аснове.

## Парадак заказу:

1. Запоўніце падпісныя дакументы:

- ЗАКАЗ на інфармацыйныя выданні НББ;
- два экзэмпляры ДАГАВОРА на выраб друкаваных і электронных выданняў.

2. Афармленыя дакументы высылайце на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*прасп. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Даведачныя тэлефоны выканаўцаў інфармацыйных выданняў гл. на с. 13-14.

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкома, то дагавор павінен заключацца **паміж НББ і аддзелам культуры выканкома**.

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.:
(+375-17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

**ДУ «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»**
Прасп. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл.: (+375-17) 293 28 22, 293 28 13

**У кіёску НББ (за наяўны разлік)**
Тэл. (+375-17) 293 28 52

**РУП «Акадэмічная кніга»**
Прасп. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375-17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ ____ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ ____ 9

Каляндарны план выхаду ў свет інфармацыйных выданняў НББ у 2009 г. ____ 13

**Дадаткі (укладышы):**

ЗАКАЗ на інфармацыйныя выданні НББ

ДАГАВОР на выраб друкаваных і электронных выданняў НББ

# Друкаваныя выданні

## 1. **Библиотеки Беларуси:** справочник

*Ответственный за выпуск Алейник М.Г.*

Справочник состоит из трех томов, отражает информацию о библиотеках всех министерств и ведомств Республики Беларусь по состоянию на 01.01.2009 г. В издании представлены адреса, телефоны, режим работы, сведения о руководителях и иные реквизиты библиотек.

Будет полезен не только библиотечным работникам и лицам, заинтересованным в сотрудничестве с библиотеками, но и всем тем, кто пользуется услугами библиотек сегодня.

7000 стр. (общее количество). Цена 146 930 бел. руб.

## 2. **Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі.** Вып. 11

*Адказны за выпуск Суша К.В.*




У чарговым зборніку навуковых прац Нацыянальная бібліятэка Беларусі працягвае публікацыю матэрыялаў па праблемах вывучэння, захавання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі кніжнай культуры. Раскрываюцца фонды рукапісаў, архіўных дакументаў, друкаванай кнігі, якія захоўваюцца ў бібліятэках, музеях і архівах Беларусі і замежжа. Уводзяцца ў навуковае карыстанне новыя дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кніжнай культуры Беларусі і іншых краін.

180 стар. Цана 9 950 бел. руб.

## 3. Материалы V Международных книговедческих чтений «Электронные библиотеки в ликвидации информационного неравенства»

*Ответственный за выпуск Капырина А.А.*

Сборник включает материалы V Международных книговедческих чтений «Электронные библиотеки в ликвидации информационного неравенства», которые проводятся Национальной библиотекой Беларуси в октябре 2009 г. В опубликованных докладах и сообщениях рассматриваются наиболее актуальные проблемы формирования и развития электронных библиотек, использования цифровых технологий как средства демократизации культуры и информации, ликвидации информационного неравенства.

252 стр. Цена 14 600 бел. руб.

## 4. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі платных паслуг у бібліятэках

*Адказны за выпуск Далгаполава А.Е.*

У метадычных рэкамендацыях раскрываецца парадак і механізм фарміравання цэн на паслугі бібліятэк з улікам патрабаванняў дзеючага заканадаўства.

Выданне можа прымяняцца бібліятэкамі розных тыпаў незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці, работнікамі бухгалтэрыі, якія ажыццяўляюць разлік цэн на бібліятэчныя паслугі.

32 стар. Цана 3 200 бел. руб.

## 5. Нацыянальная бібліятэка Беларусі = Национальная библиотека Беларуси: рэкламнае выданне

*Адказны за выпуск Капырына А.А.*

Буклет знаёміць з унікальным каштоўным аб'ектам культурнай спадчыны беларускага народа – Нацыянальнай




бібліятэкай Беларусі. Выданне прадстаўляе арыгінальныя архітэктурныя, канструкцыйныя і праграмна-тэхналагічныя асаблівасці новага будынка, яго мастацкае афармленне, знаёміць з напрамкамі работы НББ.

32 стар. Цана 14 750 бел. руб.

## 6. Новыя кнігі: па старонках беларускага друку*

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*




Бюлетэнь «Новыя кнігі» аператыўна дае інфармацыю аб найбольш важных у навуковым і пазнавальным плане навінках беларускага друку, змяшчае тэматычныя і персанальныя бібліяграфічныя спісы-дадаткі. Складаецца з двух раздзелаў – «Навінкі беларускага друку» і «У полі зроку рэцэнзента», – якія інфармуюць аб новых кнігах беларускіх выдавецтваў, найбольш значных артыкулах з беларускай перыёдыкі і рэцэнзіях на беларускія выданні. Значна дапаўняюць бюлетэнь дадаткі, якія выходзяць пад адной вокладкай з выданнем. У іх змяшчаюцца бібліяграфічныя спісы і агляды па актуальных тэмах, *«Беларускі каляндар, … год»* і матэрыялы да найбольш значных і забяспечаных публікацыямі юбілейных дат.

Выданне прызначана ў дапамогу работнікам бібліятэк і іншых культурна-асветных устаноў, выкладчыкам, студэнтам, вучням старэйшых класаў, усім, хто цікавіцца гісторыяй, культурай і праблемамі сучаснасці Беларусі, хто хоча штомесячна атрымліваць інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і дасугавай дзейнасці.

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты 2009 г. «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэкс выдання – 74972.

Тэмы дадаткаў на 2009 г.

№ 1. Даты беларускага календара (сакавік – май 2009 г.).
№ 2. Даты беларускага календара (май – чэрвень 2009 г.).
№ 3. Метадычная літаратура – настаўніку-прадметніку.
№ 4. Да 65-годдзя з часу вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
№ 5. Даты беларускага календара (ліпень – верасень 2009 г.).
№ 6. Даты беларускага календара (кастрычнік 2009 г.).
№ 7. Беларускі каляндар, 2010 год (студзень – чэрвень).
№ 8. Беларускі каляндар, 2010 год (ліпень – снежань).
№ 9. Белавежская пушча: да 600-годдзя з пачатку фарміравання запаведнага рэжыму.
№ 10. Даты беларускага календара (лістапад – снежань 2009 г.; студзень – люты 2010 г.).
№ 11. Беларусь турыстычная.
№ 12. Дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку».

## 7. **Организация обслуживания пользователей: из опыта Национальной библиотеки Беларуси:** сборник статей

*Ответственный за выпуск Долгополова Е.Е.*

Рассматриваются подходы к организации информационно-библиотечного и социокультурного обслуживания пользователей, характеризуются особенности основных направлений обслуживания, анализируется эффективность отдельных форм и методов работы с пользователями, раскрываются особенности технологических процессов обслуживания в условиях крупной научной библиотеки.

160 стр. Цена 9 000 бел. руб.

## 8. **Праблемы бібліятэчнай справы на Беларусі:** зборнік артыкулаў. Вып. 1

*Адказны за выпуск Алейнік М.Г.*

Выданне з працягам уключае матэрыялы па актуальных пытаннях бібліятэчнай справы як галіны: праблемы

фарміравання і асаблівасці захоўвання фондаў, арганізацыі абслугоўвання карыстальнікаў, пытанні прымянення сучасных тэхналогій у стварэнні інфармацыйнай прадукцыі, распрацоўцы комплексу інфармацыйна-тэхналагічных сістэм і да т. п.

Зборнік прызначаны для спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, навукоўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, кіраўнікоў органаў упраўлення культурай, а таксама ўсіх, хто цікавіцца развіццём бібліятэчнай справы.

138 стар. Цана 8 570 бел. руб.

## 9. **Рарытэты з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі:** камплект паштовак

*Адказны за выпуск Суша К.В.*

У камплекце з 16 паштовак прадстаўлены выявы унікальных рукапісаў, старадрукаў і рэдкіх выданняў, што захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Адлюстраваны рукапісныя і друкаваныя помнікі славянскай, заходнееўрапейскай і ўсходняй кніжнасці, якія з'яўляюцца найбольш каштоўнай часткай фондаў навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства.

Камплект паштовак прызначаны для кнігазнаўцаў, мастацтвазнаўцаў, мастакоў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і мастацтвам кнігі.

32 стар. Цана 8 200 бел. руб.

# Электронныя выданні

## 10. Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2009 г.

*Складальнік Гарбачова Л.В.*

Электроннае выданне (на бел., рус. мовах; 4 выпускі ў год) змяшчае матэрыялы ў выглядзе рэфератыўных аглядаў па актуальных пытаннях стану і перспектыў развіцця культуры, культурнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва; інавацыйнай дзейнасці ў сферы вольнага часу, бібліятэчнай справы, музеязнаўства, аховы культурнай і гістарычнай спадчыны; аналітычныя агляды па пытаннях выяўленчага, музычнага, тэатральнага і кінамастацтваў.

Значная частка артыкулаў падрыхтавана па матэрыялах айчыннага і замежнага друку. Акрамя аглядных і рэфератыўных інфармацыйных паведамленняў, у зборнік уключаны хроніка асноўных фактаў і падзей культурнага жыцця Беларусі за адпаведны перыяд і бібліяграфічныя звесткі аб найбольш актуальных публікацыях па пытаннях сучаснага культурнага працэсу.

У падрыхтоўцы выдання прымалі ўдзел супрацоўнікі НББ, навукоўцы, спецыялісты-практыкі і кіруючыя работнікі сферы культуры і мастацтва.

Аб'ём 20 Мб*. Цана 8 200 бел. руб.

## 11. Беларускі каляндар, 2010 год

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Электроннае выданне змяшчае інфармацыю аб найбольш значных знамянальных і памятных датах, якія будуць адзначацца ў нашай краіне ў 2010 г.

Даведачная інфармацыя да некаторых дат дапоўнена ілюстрацыйным матэрыялам, гіперспасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы.

* Аб'ём электронных выданняў указаны арыенціровачна і залежыць ад тэхналогіі праграміравання дыска.

Каляндар падрыхтаваны на аснове базы даных *«Беларусь у асобах і падзеях»* Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Выданне прызначана ў дапамогу бібліятэкарам, работнікам музеяў і сродкаў масавай інфармацыі, выкладчыкам, студэнтам, навучэнцам, а таксама ўсім, хто цікавіцца мінулым і сучасным Беларусі.

Інфармацыя прадстаўлена ў pdf-фармаце.

Аб'ём 25 Мб. Цана 8 700 бел. руб.

## 12. **Библиотека Хрептовичей**

*Ответственный за выпуск Киреева Г.В.*

Электронное издание содержит материалы по истории библиотеки Хрептовичей в Щорсах – одного из крупнейших частных книжных собраний Беларуси XVIII–XIX вв. Представлены полнотекстовые электронные копии сохранившихся описаний и наиболее ценных изданий.

Диск создается в рамках международного проекта при поддержке ЮНЕСКО «Библиотека Хрептовичей» и является первым выпуском в серии по библиографической реконструкции коллекции.

Объем 1 Гб. Цена 16 200 бел. руб.

## 13. **Запаветны напеў, запаветная даль… Белавежская пушча**

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Мультымедыйнае выданне прысвечана 600-годдзю ўстанаўлення запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы, адным з буйнейшых лясных масіваў Еўропы, на тэрыторыі якога створаны Нацыянальны парк «Белавежская пушча».

Аб'ём 2 Гб. Цана 15 000 бел. руб.

## 14. Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2009 г.

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*




Выданне ўключае звесткі аб інфармацыйнай прадукцыі на 2009 г.: наяўных базах даных уласнай генерацыі; базах даных, якія плануюцца да стварэння; выдавецкай прадукцыі, што ўтрымлівае бібліяграфічную, фактаграфічную, камбінаваную інфармацыю ў друкаванай і электроннай формах – рэсурсах навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі.

Разлічана на навукоўцаў, спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы, іншых сфер грамадскай дзейнасці, якія звязаны са стварэннем і выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў.

Інфармацыя прадстаўлена ў pdf-фармаце.

Аб'ём 7 Мб. Цана 10 050 бел. руб.

## 15. «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…»: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)

*Складальнікі: Гушчынская Л.Г., Суша К.В.*

Электроннае выданне прысвечана 170-годдзю з дня нараджэння Францішка Багушэвіча – беларускага паэта, празаіка, публіцыста, перакладчыка 2-й паловы XIX ст.

Уключае біяграфічны нарыс, бібліяграфію твораў, электронныя копіі першых выданняў пісьменніка; бібліяграфічны спіс публікацый пра жыццё і творчую дзейнасць, ілюстрацыйны і фактаграфічны матэрыял, звязаны з імем юбіляра.

Аб'ём 1 Гб. Цана 15 400 бел. руб.

## 16. **Падпольны і партызанскі друк Беларусі**

*Складальнік Белы А.В.*

Электроннае выданне, прысвечанае 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прадстаўляе электронныя копіі падпольнага і партызанскага друку, якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Музея Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Складаецца з трох раздзелаў: лістоўкі, часопісы, газеты.

Выданне будзе карысным для даследчыкаў, выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, студэнтаў і навучэнцаў – усіх, хто цікавіцца гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны.

Аб'ём 1,5 Гб. Цана 21 830 бел. руб.

## 17. **«Radziviliana»: дакументальныя помнікі з фондаў НББ:** іканаграфія Радзівілаў

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*

Электроннае выданне змяшчае паўнатэкставую электронную копію знакамітага альбома гравюр выдання 1875 г. з партрэтамі роду Радзівілаў «Icones Familiae Ducalis Radzivilianae». Ствараецца ў рамках Дзяржаўнай праграмы «Памяць Беларусі» і міжнароднага праекта «Radziviliana».

Аб'ём 600 Мб. Цана 20 200 бел. руб.

## КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН выхаду ў свет інфармацыйных выданняў НББ у 2009 г.



| № | Выданне | Адказны за выпуск | Тэлефон | Выхад у свет |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| | ***ДРУКАВАНЫЯ*** | | | |
| 1 | Библиотеки Беларуси: справочник | Алейнік М.Г. | 266-37-70<br>293-27-61 | Каст-рычнік |
| 2 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 11 | Суша К.В. | 293-27-83 | Ліпень |
| 3 | Материалы V Международных книговедческих чтений «Электронные библиотеки в ликвидации информационного неравенства» | Капырына А.А. | 266-37-07<br>293-28-02 | Каст-рычнік |
| 4 | Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі платных паслуг у бібліятэках | Далгаполава А.Е. | 266-37-17<br>293-25-07 | Сакавік |
| 5 | Нацыянальная бібліятэка Беларусі = Национальная библиотека Беларуси: рэкламнае выданне | Капырына А.А. | 266-37-07<br>293-28-02 | Студзень |
| 6 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Кожны месяц |
| 7 | Организация обслуживания пользователей | Далгаполава А.Е. | 266-37-17<br>293-25-07 | Сакавік |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 8 | Праблемы бібліятэчнай справы на Беларусі: зборнік артыкулаў. Вып. 1 | Алейнік М.Г. | 266-37-70<br>293-27-61 | Лістапад |
| 9 | Рарытэты з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: камплект паштовак | Суша К.В. | 293-27-83 | Сакавік |
| | **ЭЛЕКТРОННЫЯ** | | | |
| 10 | Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2009 г. | Гарбачова Л.В. | 293-27-19 | Штоквар-тальна |
| 11 | Беларускі каляндар, 2010 год | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Жнівень |
| 12 | Библиотека Хрептовичей | Кірэева Г.У. | 293-27-81 | Каст-рычнік |
| 13 | Запаветны напеў, запаветная даль… Белавежская пушча | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Чэрвень |
| 14 | Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2009 г. | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Жнівень |
| 15 | «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…»: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900) | Гушчынская Л.Г.,<br>Суша К.В. | 293-25-58<br>293-27-83 | Жнівень |
| 16 | Падпольны і партызанскі друк Беларусі | Белы А.В. | 293-26-12 | Май |
| 17 | «Radziviliana»: дакументальныя помнікі з фондаў НББ: іканаграфія Радзівілаў | Кірэева Г.У. | 293-27-81 | Лістапад |

## Таксама прапануем набыць выданні па «Тэматычнаму плану выпуску інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на 2008 год»

## ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 10
Мастацтва беларускай старадрукаванай кнігі: Куцеінская друкарня XVII ст.: камплект паштовак
Мастацтва рукапіснай кнігі: Пакуты Хрыстовы: Рукапіс XIX ст.: камплект паштовак
Мастацтва еўрапейскіх старадрукаў: Французская ілюстрацыя XVIII ст.: камплект паштовак
Матэрыялы Чацвёртых Міжнародных Кнігазнаўчых чытанняў «Дакументальныя помнікі ў сучасным інфармацыйным грамадстве»
I Міжнародны фестываль пейзажа: прысвечаны творчасці Віталя Цвіркі: каталог выстаўкі
Нацыянальная бібліятэка Беларусі: камплект фотапаштовак
Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ее Императорского Величества в белорусские наместничества: факсимильное издание, Санкт-Петербург, 1780

## ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ

Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2008 г.: інфармацыйна-аналітычны зборнік
Асноўныя службовыя дакументы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. 2007 г.
Беларускі каляндар, 2009 год
Библиотеки агрогородков как объект «Государственной программы возрождения и развития села на 2005–2010 гг.»
«Восток – Запад в век информационно-телекоммуникационных технологий»: материалы Международной конференции по межбиблиотечному абонементу и доставке документов (3–7 декабря 2007 г., Минск)
Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2008 г.
Имидж-каталог Национальной библиотеки Беларуси
Нацыянальная бібліятэка Беларусі = Национальная библиотека Беларуси
Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў друку. 1922–2007 гг.
Нормативно-правовое обеспечение деятельности библиотек
«Жыве паміж намі дудар наш…»: да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884)
«Radziviliana»: дакументальныя помнікі з фондаў НББ

ЛИ № 02330/0131881 ад 14.10.2004.
Тыраж  250 экз. Заказ 68.
Надрукавана на абсталяванні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.
Прасп. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
Тэл. 293 28 13.